# Юбилеи

# Jubilees



## Таццяна Мікалаеўна ДАСАЕВА

## Татьяна Николаевна ДАСАЕВА

## Tatiana Nikolaevna DASAEVA

27 ліпеня споўнілася 70 гадоў доктару філалагічных навук, прафесару Таццяне Мікалаеўне Дасаевай.

Шматгадовая плённая дзейнасць Т. М. Дасаевай забяспечыла ёй заслужаны аўтарытэт сярод навуковай грамадскасці, глыбокую павагу калег і студэнтаў. Яе навукова-педагагічны стаж складае амаль паўстагоддзя, з іх 25 гадоў Таццяна Мікалаеўна працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Шмат часу прысвяціла яна даследаванням ў галіне беларускага літаратуразнаўства, сусветнай журналістыкі і адукацыі. Нястомная энергія і высокі ўзровень прафесіяналізму дапамаглі Т. М. Дасаевай зрабіць значны ўнёсак у нацыянальную навуку.

За дасягненні ў галіне навукі і адукацыі Таццяна Мікалаеўна ўзнагароджана медалём «За доблесную працу» (1971), ганаровымі граматамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2001, 2011), выдавецтва «Беларускі Дом друку» (2001), Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2004, 2011), Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2006), Беларускага саюза журналістаў (2009), нагрудным знакам Міністэрства інфармацыі «Выдатнік друку Беларусі» (2014) і нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі» (2019).

Т. М. Дасаева нарадзілася 27 ліпеня 1951 г. у вёсцы Старцавічы (цяпер – Знамя) Слуцкага раёна Бабруйскай вобласці. У 1968 г. скончыла Урэцкую сярэднюю школу № 1 Любанскага раёна Мінскай вобласці, у 1973 г. – філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Філолаг. Выкладчык беларускай і рускай мовы

CC BY NC

і літаратуры». У кастрычніку 1973 г. паступіла ў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР. Вучобу сумяшчала з выкладчыцкай працай у сярэдняй школе в. Траскоўшчына Мінскага раёна. Пасля заканчэння аспірантуры працавала ў 1977–2000 гг. у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР (з 1991 г. – Акадэмія навук Беларусі, з 1997 г. – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі (далей – НАН Беларусі)). У 1989 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Станаўленне новага героя ў беларускай савецкай прозе 20-х гадоў» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Акадэміі навук БССР І. Я. Навуменка). Навуковую дзейнасць у НАН Беларусі сумяшчала з працай выкладчыкам кафедры беларусазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1990–1998), дацэнтам кафедры сацыяльных навук Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (1994–1999). З 1998 г. Т. М. Дасаева працуе на факультэце журналістыкі БДУ. У 1998–2003 гг. яна з'яўлялася дацэнтам кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі. У 2002 г. Таццяна Мікалаеўна абараніла доктарскую дысертацыю «Паэтыка лірызму ў беларускай публіцыстыцы і мастацкай прозе» (навуковы кансультант – доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі А. А. Лойка). 25 студзеня 2019 г. Т. М. Дасаева атрымала атэстат прафесара.

У 2003–2018 гг. Таццяна Мікалаеўна ўзначальвала кафедру замежнай журналістыкі і літаратуры. Разам з калектывам кафедры яна актывізавала навукова-даследчыцкую дзейнасць у галіне міжнароднай журналістыкі, імкнулася ўдасканаліць вучэбны працэс па спецыяльнасці «Журналістыка міжнародная» з улікам сусветнага вопыту, што дазволіла вывесці прафесійную падрыхтоўку журналістаў-міжнароднікаў на новы ўзровень, адпаведны сучасным рэаліям. З 2012 г. па 2018 г. на базе кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры прайшлі восем міжнародных навукова-практычных канферэнцый, па выніках якіх былі выдадзены змястоўныя зборнікі.

З 1 студзеня 2019 г. Т. М. Дасаева займае пасаду прафесара кафедры міжнароднай журналістыкі і з'яўляецца навуковым экспертам.

Т. М. Дасаева – аўтар больш чым 150 навуковых і навукова-метадычных работ, сярод якіх 4 манаграфіі, 4 вучэбныя дапаможнікі, а таксама навуковыя артыкулы па беларускай літаратуры і журналістыцы і інш. Яна з'яўляецца адным з аўтараў фундаментальнага чатырохтомнага даследавання «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя», падрыхтаванага і выдадзенага НАН Беларусі. Навуковыя распрацоўкі Т. М. Дасаевай шырока выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе. На іх аснове падрыхтаваны курсы «Асновы міжнароднай журналістыкі», «Гісторыя замежнай журналістыкі», «Беларуская літаратура», а таксама спецкурс «Літаратурна-мастацкая крытыка беларускіх пісьменнікаў».

Таццяна Мікалаеўна распрацавала адукацыйны стандарт па спецыяльнасці «Журналістыка міжнародная». Яна з'яўляецца кіраўніком навуковых кафедральных тэм і прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі: ажыццяўляе навуковае кіраўніцтва магістрантамі, суіскальнікамі, аспірантамі. Пад яе навуковым кіраўніцтвам у 2014 г. М. А. Валькоўскі абараніў кандыдацкую дысертацыю «СМІ ў кантэксце стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая».

Т. М. Дасаева з'яўляецца членам экспертнага савета № 7 па філалагічных навуках Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (далей – ВАК), Прафесарскага сходу БДУ, Савета факультэта журналістыкі, Саюза жанчын БДУ, камісіі па прысуджэнні прэміі імя У. І. Пічэты, вучэбна-метадычнай камісіі факультэта журналістыкі, міжнароднай рэдкалегіі двух навуковых часопісаў. Яна працавала вучоным сакратаром экспертнага савета пры ВАК, намеснікам адказнага сакратара часопіса «Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка», членам саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый пры БДУ, а таксама камісіі па сувязях са СМІ.

Таццяна Мікалаеўна неаднаразова выступала ў друку, на тэлебачанні і радыё, удзельнічала ў абмеркаванні праблем сучаснай журналістыкі і навучання замежных студэнтаў.

Навукова-педагагічную працу яна паспяхова спалучае з грамадскай дзейнасцю. Любоў да паэзіі і жаданне дапамагчы маладым талентам паспрыялі таму, што шмат гадоў Т. М. Дасаева кіравала творчым студэнцкім літаратурным аб'яднаннем «Вуліца летуценнікаў», арганізоўвала літаратурныя вечары паводле твораў класікаў беларускай літаратуры, а таксама літаратурныя чытанні і вечары творчасці студэнтаў факультэта журналістыкі.

У 2016 г. Таццяна Мікалаеўна стала лаўрэатам конкурсу «Жанчына года БДУ» ў намінацыі «Вучэбна-метадычная праца», у 2017 г. – лаўрэатам прэміі імя У. І. Пічэты ў намінацыі «Навука» за цыкл навуковых манаграфій і вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры і журналістыцы. У тым жа годзе рашэннем сходу калектыву работнікаў факультэта журналістыкі яе кандыдатура была рэкамендавана для занясення на ўніверсітэцкую Дошку гонару.

Асабіста ад сябе хацеў бы дадаць, што маю гонар ведаць Таццяну Мікалаеўну звыш 20 гадоў. За гэты час мог неаднаразова пераканацца, што яна вызначаецца выключнай працавітасцю і высокай патрабавальнасцю да сябе. Студэнты адзначаюць, што

Т. М. Дасаева даходліва і займальна выкладала на сваіх лекцыях грунтоўны навуковы матэрыял, умела знітаваць тэарэтычныя палажэнні з красамоўнымі прыкладамі. Прычына такога ўмельства, на маю думку, тоіцца ў спалучэнні энцыклапедычных ведаў Таццяны Мікалаеўны з вялікай любоўю да сваёй справы. Паўтара дзесяцігоддзя я назіраў за Т. М. Дасаевай на пасадзе загадчыка кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры. У нечым яна змянялася, адаптуючыся да новых патрабаванняў з боку кіраўніцтва, але нязменным заставалася яе добразычлівае і паважлівае стаўленне да калег і студэнтаў. Нават самае складанае пытанне яна імкнулася вырашыць тактоўна і дыпламатычна, а любое эмацыянальнае напружанне – скіраваць у канструктыўнае рэчышча. Талент кіраўніка і высокая духоўная культура Т. М. Дасаевай паспрыялі таму, што на кафедры панавала атмасфера ўзаемапавагі і ўзаемадапамогі. І сёння яна імкнецца дапамагчы кожнаму слушнай парадай, добрым словам і справай…

Таму, мяркую, маю ўсе падставы, каб павіншаваць Вас, шаноўная Таццяна Мікалаеўна, ад імя Вашых калег з юбілеем! Шчыра зычым Вам здароўя, бадзёрасці, творчых і навуковых здзяйсненняў, новых перспектыўных ідэй і магчымасцей, плённай працы і ажыццяўлення ўсіх замыслаў!

***Я. Ф. Конеў***[1]

[1]*Егор Федорович Конев* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры международной журналистики факультета журналистики Беларуского государственного университета.

*Egor F. Konev*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of international journalism, faculty of journalism, Belarusian State University.

E-mail: *egorkonev1970@gmail.com*